# *ХРОНИКА НАУЧНОЙ ЖИЗНИ*

## МІЖНАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «МОВА, ЛІТАРАТУРА І КУЛЬТУРА Ў АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ»

(Мінск, 26–27 верасня 2019 г.)

26 верасня 2019 г. у Нацыянальным інстытуце адукацыі адбылося адкрыццё міжнароднай канферэнцыі «Мова, літаратура і культура ў адукацыйнай прасторы Беларусі і Кітая», арганізатарамі якой сталі Лабараторыя гуманітарнай адукацыі згаданага інстытута і Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў. З кітайскага боку канферэнцыя прайшла пры падтрымцы Інстытута еўрапейскіх моў і культур, Цэнтра даследаванняў Беларусі, Цэнтра Якуба Коласа. Дарэчы, на сённяшні дзень у Кітаі існуе 11 цэнтраў вывучэння беларускай мовы і культуры.

Мадэратар канферэнцыі Г.М. Валочка (д-р пед. навук, галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі) расказала, што нагодай правядзення навуковага форуму сталі дзве вялікія падзеі: 2019 г. абвешчаны годам адукацыі Беларусі ў Кітаі і 90-годдзе Нацыянальнага інстытута адукацыі. Нацыянальны істытут адукацыі на сённяшні дзень – гэта мульціпрофільная ўстанова адукацыі, цэнтр развіцця педагагічнай навукі і адукацыйнай практыкі Рэспублікі Беларусь. У ім вядзецца навукова-даследчая дзейнасць, навукова-метадычная дзейнасць па выданні вучэбных дапаможнікаў, навукова адукацыйная дзейнасць (падрыхтоўка навуковых супрацоўнікаў вышэйшай кваліфікацыі ў аспірантуры і дактарантуры), выдаюцца часопісы «Педагогическая наука и образование» і «Веснік адукацыі». З 2014 г. Нацыянальны інстытут адукацыі ўваходзіць у Еўразійскую асацыяцыю ацэнкі якасці адукацыі, у межах праграмы «Адзін пояс, адзін шлях» развівае эканамічныя і міжнародныя адносіны, заснаваныя на ўзаемаразуменні.

В.Ф. Русецкі (д-р пед. навук, дацэнт Нацыянальнага істытута адукацыі) распавёў пра вопыт супрацоўніцтва Нацыянальнага істытута адукацыі і ўстаноў навукі і адукацыі Кітая, адзначыўшы, што ў Кітаі маецца вялікая зацікаўленасць у вывучэнні культуры Беларусі. Так, напрыклад, у Цяньцзінскім універсітэце замежных моў паспяхова дзейнічае Цэнтр даследаванняў Беларусі, там усталяваны помнік Якубу Коласу – помнік першаму беларусу ў Кітаі. Менавіта там як запрошаны прафесар выкладае беларускую мову Г.М. Валочка.

У Хучжоў існуе міжкультурны цэнтр Азербайджана, Казахстана, Украіны і Беларусі, разам з якім Нацыянальны істытут адукацыі выдае часопіс «Міжкультурныя даследаванні» (на рускай, кітайскай і англійскай мовах), і дзе ў 2020 г. плануецца выданне даследавання «Беларусь сёння». Універсітэт адукацыі Ганконга арганізуе заняткі для беларускіх настаўнікаў кітайскай мовы, ужо прайшло 14 адукацыйных школ. Пра шэраг мерапрыемстваў можна прачытаць на сайце нацыянальнага адукацыйнага партала, на старонцы «Беларусь – Кітай: традыцыі і сучаснасць», у прыватнасці пра праведзены конкурс «Мост у будучыню». Плануецца выданне спецнумару часопіса «Педагогическая наука и образование», прысвечанага году беларускай адукацыі ў Кітаі.

Шы Лін, дырэктар інстытута Канфуцыя ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, распавяла пра сацыяльныя функцыі гэтай установы, гісторыю дзейнасці ў Беларусі. Створаны ў 2011 г. кітайска-беларускі адукацыйны цэнтр, выпусціў ужо каля 10 тыс. слухачоў. Па свеце такіх цэнтраў больш за 500. Інстытут Канфуцыя ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце у 2013 г. атрымаў званне лепшага. Сярод вынікаў дзейнасці можна згадаць мемарандум аб супрацоўніцтве Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і Паўднёва-Заходняга ўніверсітэта Кітая, рэгулярна праходзіць кітайска-беларускі адукацыйны форум, Інстытут Канфуцыя супрацоўнічае з 13 вучэбнымі ўстановамі Беларусі.

Пра моўныя інвестыцыі Кітая ў Беларусь разважала Лі Інін (PhD, прафесар Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў, дырэктар Інстытута еўрапейскіх моў і культур). Сёння беларуская мова як спецыяльнасць бакалаўрыята існуе ў некалькіх універсітэтах Кітая. У Цяньцзінскім ўніверсітэце вывучаюцца 33 замежныя мовы, 29 з якіх вызначаны прыярытэтнымі – мовы краін, блізкіх да Кітая. Гэта своеасаблівае лінгвістычнае забеспячэнне знешнепалітычнай стратэгіі па збліжэнні з культурамі, якія вывучаюцца, з якімі Кітай плануе кантактаваць на розных узроўнях. Лі Інін было адзначана выкарыстанне лінгвістыкі для вырашэння пытанняў знешняй палітыкі. Што да Беларусі, то ў Цяньцзінскім універсітэце адбыўся фестываль беларускай культуры, прайшло азнаямленне з беларускім культурным кодам праз арнамент і традыцыйныя строі. У задачы Цэнтра Якуба Коласа, што лакалізаваны там жа, уваходзіць падтрымка педагогаў-беларусістаў у Кітаі, стварэнне хрэстаматыі па краіназнаўстве Беларусі, ліквідацыя прабелаў у полі іміджавай інфармацыі пра Беларусь.

Чжао Сін (канд. пед. навук, выкладчык Першага Пекінскага ўніверсітэта замежных моў) былі раскрыты асаблівасці развіцця беларускай мовы як замежнай у Кітаі. Дарэчы, у працяг размовы пра лінгвістычную стратэгію Кітая, у Пекінскім універсітэце замежных моў вывучаюць 101 мову, у тым ліку беларускую як спецыяльнасць бакалаўрыята. Беларуская мова належыць да так званых «малых моў», якія, як патлумачыў дакладчык, мала выкарыстоўваюцца ў міжнародных зносінах. У студзені 2019 г. у Пекінскім універсітэце быў адкрыты Цэнтр вывучэння Беларусі.

Пра дыялог беларускай і кітайскай культур у вучэбных дапаможніках новага пакалення на беларускай мове распавяла В.У. Зелянко (д-р пед. навук, дацэнт Нацыянальнага інстытута адукацыі, намеснік дырэктара інстытута па навукова-даследчай рабоце). Выступоўца падкрэсліла, што ўмовы для эфектыўнага дыялогу культур – гэта ўласнае пражыванне фактаў культуры. Былі прадстаўлены два дапаможнікі для 5 і 9 класаў, аналізаваўся моўны і культуралагічны дыялог «па вертыкалі» (у ходзе гісторыі), і «па гарызанталі» (кантакты з іншымі народамі).

Працяг абмеркавання шэрагу актуальных пытанняў надалей адбыўся ў шасці сесіях:

- «Вывучэнне мовы, літаратуры і культуры ў іх спецыфіцы і ўзаемадзеянні ва ўстановах Беларусі і Кітая»;
- «Лінгвакультуралагічная інтэрпрэтацыя тэксту ў працэсе навучання»;
- «Моўная карціна свету і праблемы міжкультурнай камунікацыі»;
- «Пераклад як від міжкультурнай камунікацыі»;
- «Навучанне мовам і літаратуры ў дыялогу культур»;
- «Сучасныя падыходы да стварэння падручнікаў (вучэбных дапаможнікаў) па беларускай / кітайскай мове, літаратуры, мастацтве, культуры».

Трэба адзначыць высокую інфармацыйнасць дакладаў канферэнцыі, такія мерапрыемствы сапраўды вырашаюць задачу эфектыўнай міжкультурнай камунікацыі і супрацоўніцтва.

***канд. філал. навук, дац. С.М. Лясовіч***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***